ISSN 0869-3501

# Пачатковая школа

1/93

«...Адзін з самых дзейсных сродкаў у станаўленні дзяржаўнасці — дасканалая літаратурная мова...»

*Ніл Гілевіч*

**(Матэрыялы з навуковай канферэнцыі «Праблемы беларускага правапісу», с. 1 — 6)**






«...Сёння настаўнік разам са сваімі вучнямі апынуўся ў амаль што тупіковай сітуацыі».

*М. А. Гусакоўскі*

**(«Філасофія развіццёвага навучання», с. 10 — 12)**

# МАРАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫЯ ПОГЛЯДЫ СЫМОНА БУДНАГА

З студзеня 1993 г. споўнілася 400 год з дня смерці Сымона Буднага — аднаго з тытанаў айчыннага Адраджэння, чый уклад у фарміраванне нацыянальнай духоўнай культуры, у развіццё свядомасці беларускага народа ацэнены яшчэ далёка не поўнасцю. Ідэі і погляды слыннага мысліцеля Рэнесансу, рэзка разламаўшы цемрашальскія аковы сярэднявечча, узняліся да асляпляльных вяршынь дасягненняў чалавечага генію і, бы тыя маякі ў непрагляднай цемры, сталі арыенцірамі для яго сучаснікаў і іх нашчадкаў у вечным імкненні людзей да дасканалай арганізацыі супольнага і асабістага жыцця, да ўдасканалення розуму і духу. Многія запаветы нашага знакамітага супляменніка і сёння, праз чатыры стагоддзі, гучаць не менш актуальна. Як бы пра падзеі дня сённяшняга пісаў С. Будны: «Я не бачу прычыны, чаму супрацьлеглыя погляды могуць перашкодзіць супрацоўніцтву людзей. Нават жа святыя апосталы і тыя не ва ўсім былі згодныя між сабой...» (8, 38-39).

Важкі ўклад унёс Сымон Будны ў развіццё многіх напрамкаў грамадскай і філасофскай думкі. Шматлікія яго ідэі ў рознай ступені вывучаны даследчыкамі. Погляды ж мысліцеля на праблемы маральнага аздараўлення грамадства пакуль што застаюцца па-за увагай вучоных. Таму на разглядзе некаторых з гэтых поглядаў і хацелася б спыніцца.

Этыка-педагагічная накіраванасць адраджэнцкіх працэсаў на Беларусі мела асабліва спрыяльную глебу, бо яшчэ з часоў Кіеўскай Русі духоўна-маральным пытанням тут надавалася першараднае значэнне. Не выпадкова, што этычны кампанент у поглядах С. Буднага займае выключна важнае месца.

Пераасэнсаванне значэння маралі ў жыцці грамадства грунтавалася ў Буднага на радыкальнай перамене поглядаў на ролю і прызначэнне чалавека ў жыцці, што ў сваю чаргу выклікалася рэнесанснa-гуманістычнай накіраванасцю айчыннай адраджэнцкай думкі. Яна, прынамсі, мела шэраг адметных асаблівасцей у параўнанні з заходнееўрапейскай. У процівагу сярэдневякова-артадаксальным поглядам, згодна з якімі чалавек на зямлі аскетызмам, пакорлівасцю і цярпеннем павінен быў заслужыць сабе лепшую долю толькі на тым свеце, слынныя беларускія мысліцелі, пачынаючы са Скарыны, недвухсэнсоўна арыентавалі людзей на рэальнасці «сегосветного жития» (7, 21).

Абвяргаючы меркантыльна-гандлярскія падыходы да разумення вытокаў маральнасці, С. Будны сцвярджаў, што дабрачыннае жыццё само па сабе з'яўляецца вышэйшай узнагародай для душы чалавека. Ён лічыў, што нават жахі пекла ёсць не што іншае, як пакуты ўласнага нячыстага сумлення (2, 61-61 адв.). Больш таго, упэўнены ў неабмежаваных магчымасцях усіх людзей, ён шляхам лагічных разважанняў прыходзіць да высновы, што і «Ісус Хрыстос з'яўляецца зямным чалавекам, які дабіўся боскай сутнасці дзякуючы свайму высокамаральнаму, дабрачыннаму жыццю» (4, 88).

Асэнсоўваючы ролю маральнага выхавання ў фарміраванні прыстойнай асобы, С. Будны прыйшоў да высновы, што з яго дапамогай чалавек можа і нават павінен удасканальваць сваю прыроду. Насуперак артадаксальным дагматам аб прыроджанай прадвызначанасці людскога лёсу ён катэгарычна заяўляў, што чалавек ёсць прадукт выхавання. «Не трэба здзіўляцца, — пісаў ён аб маральных якасцях людзей, — гэта ў іх не ад прыроды, а ад дрэннага выхавання» (3, 50). Ён падкрэсліваў крайнюю неабходнасць спецыяльнай арганізацыі выхаваўчай работы ў грамадстве, пераконваў, што калі гэты працэс будзе ажыццяўляцца не належным чынам, то такі прагал запоўніць сатана, які наставіць людзей на шкодны шлях. «Коли ся ленили учити людей, — перасцерагаў С. Будны. — научил их диавол» (3, 50).

Сымон Будны быў высокаадукаваным для свайго часу чалавекам, ён бязмежна верыў у сілу розуму і навукі і тым не менш у станаўленні чалавечай асобы ставіў фарміраванне высокай духоўнасці наперадзе адукацыі. Вось чаму пры вызначэнні месца маральнага выхавання ў гэтым працэсе ён пісаў: «Наипервей выхованье, потом науку, а третье наказанье, або каранье» (2, 162).

Пераасэнсаванне ролі маральнага выхавання ў арганізацыі грамадскага жыцця ўвогуле і станаўленні кожнай асобы ў прыватнасці дазволіла беларускім гуманістам XVI стагоддзя адрадзіць і напоўніць новым сэнсам галоўную выхаваўчую мэту, якая была вылучана і абгрунтавана ў свой час дзеячамі антычнай культуры, якой затым была абвешчана анафема і на якую забылася сярэднявечча са сваёй славутай формулай «калакагатх!!». «Да совершенен будет человек божий и на всякое дело добре уготован» (7,14) — так сфармуляваў асноўную выхаваўчую мэту Францыск Скарына. Прычым

дасканаласць ім разумелася ў першую чаргу як маральная дасканаласць, якая грунтавалася на строгім выкананні прадпісанняў Свяшчэннага пісання.

Будны ж дасканаласць чалавека трактаваў яшчэ шырэй. Як і ў іншых паслядоўнікаў Скарыны, маральны ідэал у яго ўяўленні — дабрачынная, адукаваная, усебакова развітая асоба. Падкрэсліваючы, што фарміраванне прыстойнай асобы павінна грунтавацца менавіта на ўсебаковым яе развіцці, асветнік пісаў: «Нехай учатся христиане наук потребных, яко писанию, богословию... лекарству и иншим почтивым наукам» (2, 61-61 адв.). Але ж, не спыняючыся на гэтым, ён узнімае ідэал маральнай дасканаласці на якасна новую ступень, дапаўняючы яго рысамі свабодных, крытычных адносін да рэчаіснасці з непамерна больш высокім пачуццём уласнай годнасці.

Як і многія іншыя перадавыя мысліцелі, С. Будны асновай маральнага развіцця асобы лічыў веды. Аднак ён ідзе значна далей, чым яго папярэднікі, лічачы вышэйшым дасягненнем розуму такую ступень яго развіцця, калі з дапамогай мыслення можна тлумачыць навакольную рэчаіснасць. «Неабходна падвяргаць выпрабаванню ўсё, з чым маеце справу, — пісаў вучоны, — інакш мы не толькі не збавімся ад памылак, а яшчэ больш увязнем у іх» (9, 159). Больш таго, імкненне да ісціны ён атаясамлівае з імкненнем да дабрачыннасці. С. Будны настолькі абсалютаваў веды, што паставіў іх вышэй за веру. Яны ў мысліцеля становяцца першараднай этычнай каштоўнасцю, накіроўваючы чалавека на правільны шлях. На яго думку, правільнасць любога вучэння, у тым ліку і рэлігійнага, чалавек павінен правяраць розумам і толькі пасля гэтага яму верыць. «Пазнавайце ўсё, — павучаў мысліцель, — а згаджайцеся толькі з тым, што правільна» (3, 63).

Падобныя радыкальныя ідэі ўносілі свежую плынь у існаваўшую сістэму маральнага выхавання. Прапануемы Будным ідэал свабоднай асобы ламаў саслоўна-карпаратыўныя рамкі, адкрываючы чалавеку прастору для стваральнай ініцыятывы, умацоўваў веру ва ўласныя сілы.

Не ставячы пад сумненне саслоўныя адрозненні, Будны ўсё ж зыходзіў з прыроднай роўнасці людзей, сцвярджаючы, што ў любых слаях грамадства могуць быць людзі з высокім інтэлектуальна-маральным узроўнем. «Майце на ўвазе, — адзначаў ён, — што і таргавец зелянінай бывае гаворыць правільна» (3, 63). Мысліцель нават лічыў, што чалавек можа пераходзіць з аднаго саслоўя ў другое, і прадстаўнікі знаці не павінны прэтэндаваць на сваю выключнасць у грамадстве, бо «яны такія, як і ўсе людзі» (8, 149).

Не дзіўна, што змест маральнага выхавання ва ўяўленні С. Буднага павінен быць накіраваны на набыццё асобай рыс і якасцей, уласцівых кожнаму чалавеку, незалежна ні ад яго сацыяльнага становішча, ні нават ад канфесіянальнай прыналежнасці. Такая арыентацыя дазволіла Буднаму ўзняцца да ўсведамлення прыярытэту агульначалавечых маральных каштоўнасцей перад усімі іншымі. Погляды выдатнага педагога, як бачна, былі глыбока пранізаны ідэямі гуманізму і насілі ярка выражаную дэмакратычную афарбоўку.

Маральнае выхаванне, як быў перакананы мысліцель, павінна ў першую чаргу будавацца на трывалых нацыянальных асновах. Таму не выпадкова, што менавіта Сымон Будны і з'яўляецца творцам першай беларускай друкаванай кнігі, выдадзенай на тэрыторыі цяперашняй Беларусі, поўная назва якой — «Катехисіс то ест наука стародавная хрістіаньская от светого писма для простых людей языка руского, в пытаніах и отказех събрана». Убачыла свет гэтая кніжка ў Нясвіжы 10 чэрвеня 1562 года.

Глыбока заклапочаны станам развіцця нацыянальнай культуры і яе падмурка — роднай мовы, ён звяртаецца да суайчыннікаў з заклікам, які быццам бы звернуты да сённяшняга беларускага грамадства: «К тому тежь и для того, абы ся ваши княжацские милости не только в чужоземских языцех кохали, але бы ся тежь ваши княжацские милости и того здавна славного языка словеньского размиловати и оным ся бавити рачили» (6, 25).

Абвясціўшы чалавечы розум і мудрасць найпершымі перадумовамі паспяховага ажыццяўлення маральна-выхаваўчага працэсу, С. Будны паступова прыйшоў да высновы, што важнейшым шляхам маральнага выхавання з'яўляецца ўздзеянне на свядомасць і пачуцці чалавека. Педагог-вучоны сцвярджаў, што перакананні не павінны сілай навязвацца выхаванцам, а выпрацоўвацца тымі на аснове свабоднага і самастойнага асэнсавання маральных патрабаванняў.

У этыка-педагагічнай думцы Беларусі С. Будны зрабіў значны крок ад сярэдневяковай імператыўнасці маральных прадпісанняў да інтравертнага характару маральнасці чалавека. Ён быў упэўнены, што адной з мэт маральнага выхавання падрастаючых пакаленняў павінна стаць развіццё ў маладым чалавеку здольнасці самому фарміраваць свае паводзіны, кантраляваць і рэгуляваць маральнасць сваіх учынкаў.

Зусім заканамерна, што пры такіх падыходах паступова скарачалася ўдзельная вага забарончых функцый у маральным выхаванні, што ўжо яскрава сведчыла аб прагрэсіўнасці тэндэнцый фарміравання яго тэарэтычных асноў.

З цягам часу Будны прыйшоў і да значнага пераасэнсавання ролі выхаванца ў маральна-выхаваўчым працэсе. Педагог ужо не лічыць яго пасіўным аб'ектам выхаваўчага ўздзеяння. А, наадварот, выхаванец, у яго разуменні, павінен быць актыўным, думаючым, умець крытычна ставіцца да атрымліваемай інфармацыі. Вось чаму Будны падкрэслівае: «Варта было б, каб у нас ужо была свабода гаварыць аб божаскіх справах не толькі вучоным, але і простым людзям, не толькі настаўнікам, але і вучням, не толькі пастырам, але і авечкам, або слухачам, не толькі багатым, але і бедным — толькі б правільна» (3, 70).

Сымон Будны рэзка пратэставаў супроць аўтарытарызму ў выхаванні, інакш не пазбегнуць памылак і ўпадання ў зман, «таму што кожнаму

чалавеку нішто так не ўласціва, як памыляцца» (3, 59). Ён з абурэннем пісаў, што пасля таго як некалькі аўтарытэтаў устанаўліваюць нейкі пастулат, на аснове якога потым будуецца выхаваўчая работа, то «яны ўжо не прыслухоўваюцца ні да чыіх парад» (3, 70). У гэтым плане заслугоўваюць увагі меркаванні Буднага аб тым, што вельмі ўзважана варта падыходзіць да ўсялякіх новых ідэй. Асветнік перасцерагаў, што, калі «з'явіцца што-небудзь такое, якое ўяўляецца справай новай альбо нягоднай, не трэба яго адразу прымаць альбо адкідваць» (3, 71).

Так, Будны абураны тым, што многія бацькі і паны, якія маюць падначаленых, замест ласкавага з імі абыходжання «сілай падпарадкоўваюць людзей сваёй тыраніі» (3, 89). Робячы акцэнт на гуманных, уважлівых адносінах да выхаванцаў, вялікую ўвагу Будны ўдзяляў не толькі зместу, але і форме абыходжання з імі, «бо не вже золото злая речь» (3, 51). Выступаючы ад імя настаўнікаў, ён перасцерагаў калег, каб ніякія пачуцці «не даводзілі нас да запальчывасці» (3, 69).

Новыя падыходы да маральнага выхавання патрабавалі і новага настаўніка-выхавальніка. Параўноўваючы тагачасных духоўных пастыраў са слепакамі, якія вядуць людзей самі не ведаючы куды, асветнік пісаў: «...Тыи, пак, не только не научають, але и сами мало правды знають... Вси бо ведаем, яковых теперь учителей маем» (2, 6). Ідэалам жа Буднага быў высокамаральны, творчы выхавальнік, які павінен ратаваць людзей ад «духовной гнили». Таму ён згаджаўся з біблейскім сцвярджэннем, што настаўнікі — гэта «соль зямлі» (1, 72).

Будны ў дасканаласці валодаў дзесяццю мовамі, таму ў пісьме рускаму ерэтыку Арцемію выказваў думку аб тым, што «многи языки имети учителем добро» (5, 1324). У той жа час неабходнай умовай адукаванасці і выхаванасці ён лічыў веданне айчыннай культуры і роднай мовы. Ён быў упэўнены, што выхавальнік павінен быць узорам паводзін для сваіх выхаванцаў, таму шчыра абураўся, што Кальвін «сам не быў пазбаўлены таго, што ганьбаваў у іншых» (3, 69).

Традыцыі народнай педагогікі, асноўныя пастулаты хрысціянскай этыкі, скіраванасць выхавання на фарміраванне актыўнай, дзейснай асобы пад-водзілі беларускага мысліцеля да разумення працы як аднаго з асноўных сродкаў маральнага развіцця чалавека. Падкрэсліваючы дэфармуючае ўздзеянне гультайства на яго маральную прыроду, Будны асабліва выдзяляў выхаваўчую ролю грамадска карыснай, фізічнай працы. Як пераканаты арыянін, Будны лічыў, што працаваць не сорамна і вышэйшай знаці, бо «рамяством займаўся нават апостал Павел» (8, 212). Наогул для яго этычных поглядаў характэрна імкненне прывіць любоў і павагу да працы і да простых працоўных людзей. Ён лічыў, што ў грамадстве неабходна «честь отдавати людем ремесленым, заровно з шляхтою», «...бо яко от родителей тело маем, иже оное тело можем заховати, абы одежду и пищу мело» (2, 51).

Увогуле ж С. Будны меркаваў, што маральнае выхаванне падрастаючых пакаленняў толькі тады дасягне найвышэйшых вынікаў, калі навакольная рэчаіснасць будзе ў найбольшай ступені адпавядаць духу маральных сентэнцый існуючай у грамадстве выхаваўчай сістэмы. Таму ён заўзята бічаваў такія маральныя заганы людзей, як марнатраўства, імкненне да непамернай раскошы, распуста, п'янства і інш. Нават кароль, сцвярджаў Будны, калі ён мае сапраўдную хрысціянскую душу, не можа папаўняць казну «шляхам абцяжарвання падданых» (3, 77).

Падсумоўваючы сказанае, варта яшчэ раз адзначыць, што ўклад у распрацоўку тэарэтычных асноў маральнага выхавання, зроблены Сымонам Будным, істотна папоўніў арсенал ідэй этыка-педагагічнай думкі Беларусі эпохі Адраджэння, што садзейнічала яе крутому павароту да чалавека, да раскрыцця яго бязмежных магчымасцей. Многія падыходы айчыннага мысліцеля да маральнага ўдасканалення грамадства, да лячэння язваў яго духоўнай эрозіі шляхам выхавання, і ў першую чаргу падрастаючых пакаленняў, цікавыя не толькі з пазнавальнага боку. Яны, вядома, не ўяўляюць сабой набор гатовых педагагічных рэцэптаў, якія могуць быць механічна перанесены на сучасную глебу, аднак іх творчае вывучэнне і асэнсаванне, магчыма, дапаможа ў вырашэнні тых адказных і складаных задач, што стаяць сёння перад айчыннай педагагічнай навукай і практыкай.

## ВЫКАРЫСТАНЫЯ ЛІТАРАТУРНЫЯ КРЫНІЦЫ


1. Антология педагогической мысли Белорусской ССР. — М. 1986.

2. Будный С., Крышковский Л., Кавечинский М. Катехисіс то ест наука стародавная хрістіаньская от светого писма для простых людей языка рускоro, в пытаніах и отказех събрана. — Несвиж, 1562.

3. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избр. произведения XVI — начала XIX в. — Мн., 1962.

4. Порецкий Я. И. Цюрихинская рукопись Симона Будного (Веснік Бел. дзярж. ун-та. Серыя IV: Філалогія. Журналістыка. — 1969. № 1. — С. 86 — 89.

5. Послания старца Артемия XVI века // Русская историческая библиотека. — СПб., 1878. — Т. 4.

6. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны. Мн., — 1991.

7. Скарына Ф. Творы: Прадмовы, сказанні, пасляслоўі, акафісты, пасхалія. — Мн., 1990.

8. Budny S. O urzędzie mieza używającym (1583) / Wyd. S. Kot. - Warszawa, 1932.

9. Dedyhacya, przedmova i przypipski S. Budnego do przekladu Nowego Testamentu z r. 1574//H. Merczyng Szymon Budny jako krijtyk Tekstów biblijnych. - Kraków, 1913.



**В. С. БОЛБАС, аспірант кафедры педагогікі і псіхалогіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Францыска Скарыны.**